Нужно выйти к доске, назвать вредную привычку и охарактеризовать ее, на что она пагубно влияет в организме. *(Ребята прикрепляют гексы на доске: алкоголь, табакокурение, наркотики, малоподвижность, сладости, переедание и характеризуют их пагубное влияние на организм).*

Молодцы, ребята!

Теперь рассмотрите картинки на экране и определите, под каким номером изображены люди, имеющие вредные привычки? *(№1, 5)*

На каких картинках люди ведут здоровый образ жизни? *(№2, 3, 4)*

Правильно.

**VIII. Этап обобщения и систематизации знаний и способов деятельности.**

Наше путешествие по страничкам журнала «Здоровый образ жизни» заканчивается.

Давайте еще раз вспомним, какие составляющие входят в понятие «Здоровый образ жизни»? *(Ребята перечисляют составляющие здорового образа жизни).*

Здоровый образ жизни направлен на профилактику чего? *(Болезней)* И укрепление чего? *(Здоровья).*

**IX. Этап рефлексии.**

Ребята, подводя итог нашего урока, поделитесь своими знаниями и впечатлениями.

Я узнал …

Мне было …

Я теперь всегда буду … *(Ребята делятся своими впечатления и знаниями, опираясь на тематику урока).*

Хорошо, спасибо!

*Учитель открывает на доске шестую страничку журнала «ЗОЖ».*

У нас осталась одна непрочитанная страничка журнала «Здоровый образ жизни». На этой страничке вы должны оставить свой отзыв о нашем уроке. Если он вам понравился, был полезным и познавательным, то прикрепите на этой страничке красное сердечко здоровья. Если урок вам чем-то не понравился, то прикрепите синее сердечко здоровья. *(Учащиеся прикрепляют сердечки здоровья на шестую страничку журнала на доске).*

В конце урока хочется вам сказать: «Будьте здоровы! Берегите себя и свое здоровье!» До свидания!

*Дата поступления в редакцию: 29.06.2023*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ УРОКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” Ў V КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “ПРАЦЯЖНІК ПАМІЖ ДЗЕЙНІКАМ І ВЫКАЗНІКАМ, ЯКІ ВЫРАЖАНЫ НАЗОЎНІКАМ”

*Пушнова Алена Міхайлаўна*

**Мэта:** вучыць ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікам у назоўным склоне, фарміраваць уменне асэнсавана ўжываць простыя сказы ў маўленні, выхоўваць любоў да роднай зямлі, сваёй Радзімы.

**Задачы:**

дапамагчы вучням засвоіць і актуалізаваць веды па тэме ўрока;

садзейнічаць удасканаленню ўменняў ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам;

развіваць у вучняў культуру вуснага і пісьмовага маўлення;

спрыяць абуджэнню грамадзянска-патрыятычных пачуццяў да Радзімы, да роднага краю.

**Тып урока:** камбінаваны з выкарыстаннем элементаў тэхналогіі крытычнага мыслення.

**Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:** вучэбны дапаможнік (Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. Ч. 1 / Г. А. Валочка, В.У. Зелянко, С. В. Мартынкевіч і інш. — Мінск: Нац. ін¬т адукацыі, 2019), карткі з заданнямі, малюнкі, слоўнікі, “кветкавая паляна ведаў”.

**Эпіграф:** ”Беларусь — наша маці і мова, паветра і хлеб” (У. Караткевіч)

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант.**

1.1. Праверка падрыхтаванасці вучняў.

1.2. Стварэнне псіхалагічнага настрою.

***Слова настаўніка.***

Вітаю тых, хто сёння з задавальненнем ішоў у школу і хоча атрымаць на ўроку добрую адзнаку, тых, у каго добры настрой і хто любіць вучыцца, тых, хто ведае, што ён трапіў на ўрок беларускай мовы, які нам дапаможа адкрыць не толькі новыя веды, але і далучыцца сэрцам да прыгожага роднага слова, да сваёй Радзімы і роднага краю.

Уладзімір Караткевіч у свой час пакінуў нам мудры запавет "Любіце гэту святую зямлю аддана і да канца, інакшай вам не дадзена. Памятайце: Беларусь — наша маці і мова, паветра і хлеб". Менавіта радкі з гэтага выслоўя сёння і стануць эпіграфам да ўрока.

**II. Актуалізацыя ведаў.**

2.1. Дапоўніце схему, вызначце, якія бываюць сказы па інтанацыі і мэце выказвання. (Малюнак).

2.2. Праверка дамашняга задання.

На дошцы запісаны сказы:

*Беларусь з'яўляецца цікавым і непаўторным краем. У краіне жыве мужны і працавіты народ. Гасцінна і шчыра мы сустракаем сяброў. Я ганаруся сваёй Радзімай, сваёй Бацькаўшчынай.*

Заданне:

— Вызначце граматычную аснову ў сказах.

— Назавіце, чым выражаны дзейнік і выказнік.

— Дайце характарыстыку сказаў, выкарыстоўваючы схему.

2.3. Ствараем праблемную сітуацыю.

— Як пішуцца словы з...мля, з...мляны, б..раг, прыб...рэжны, п...сня, засп...ваць, в...села, в...селле?

— Якое правіла трэба ведаць, каб правільна запісаць гэтыя словы? *(правапіс е, я ў першым складзе перад націскам).*

Узаемаправерка *(вучні абменьваюцца сшыткамі, параўноўваюць запісы з правільным варыянтам на дошцы).*

**III. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

Звяртаемся да "кветкавай паляны ведаў".

***Слова настаўніка.*** Пакажыце, дзе знаходзіцца ваша кветачка ведаў. Жадаю, каб ваша кветачка дацягнулася як мага вышэй да сонейка. А ваша праца на ўроку была плённай, актыўнай і таксама дасягнула выдатных вышынь. *(Вучні павінны на кожным этапе ўрока паказваць, як паступова расце іх кветачка разам з ведамі, якія яны набываюць).*

**IV. Паведамленне тэмы, пастаноўка задач урока.**

***Слова настаўніка.*** Я прапаную перад тым, як непасрэдна перайсці да тэмы ўрока, запісаць дамашняе заданне, якое вы выканаеце да наступнага ўрока *(§20, пр. 151).*

Прачытайце, калі ласка, заданне да практыкавання. Як вы лічыце, што мы павінны сёння разгледзець на ўроку, каб правільна выканаць заданне. *(Вучні зачытваюць патрабаванне да практыкавання і прыходзяць да высновы, што трэба пазнаёміцца і засвоіць правіла пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікам).*

Тэма ўрока "Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікам" (вучні робяць запіс тэмы ў сшытак).

Давайце разам вызначым задачы ўрока:

1) пазнаёміцца з правілам па тэме ўрока;

2) запомніць і прымяняць на практыцы правіла пастаноўкі працяжніка;

3) замацаваць і паўтарыць набытыя веды.

Задачы пастаўлены, будзем рухацца наперад, да новых адкрыццяў і дасягненняў.

**V. Вывучэнне новай тэмы.**

5.1. Актывізацыя пазнавальнай і пошукавай дзейнасці вучняў.

Праца з падручнікам.

Пытанні на ўсведамленне прачытанага.

Праца з эпіграфам да ўрока (вучні запісваюць у сшыткі, адзін вучань працуе каля дошкі).

Беларусь — наша маці і мова, паветра і хлеб.

Заданне:

Падкрэсліце граматычную аснову.




Малюнак. — Сказы па інтанацыі і мэце выказвання

Якое пытанне ставім ад дзейніка да выказніка?

Як вы разумееце выказванне аўтара?

Радзіма, Айчына, Бацькаўшчына. Ці можна ў гэты рад дадаць назву нашай краіны — Беларусь? Чаму?

Праца з практыкаванннем 149 *(вучні фармулююць правіла, якое яны выкарыстоўвалі пры выкананні практыкавання).*

Праца з карткамі *(у кожнага на парце ляжыць тэкст).*

**Заданне:** пастаўце пасля дзейніка прапушчаны знак прыпынку, патлумачце.

**Дастатковы ўзровень:** Прачытайце тэкст. Вусна складзіце працяг тэксту. Як вы лічыце, што зрабіла настаўніца, калі даведалася, дзе Данік пакінуў кветкі?

*Абеліск ля дарогі*

*Усё было цудоўным у гэты вераснёвы дзень. Зіхацела сонца, сінела неба. Першы раз Данік ішоў з бацькам у школу. У руцэ хлопчык трымаў прыгожы букет кветак. Бацька і Данік вялікія дружбакі.*

*Выйшлі яны з вёскі. Ля дарогі стаяў абеліск. Гэты абеліск даніна загінуўшым воінам. Бацька расказаў Даніку пра бой партызан з фашыстамі.*

*Данік уважліва слухаў, а потым паклаў свае кветкі ля абеліска.У клас ён прыйшоў без кветак. Але настаўніца… . (Паводле У.Караткевіча.)*

*(Разважанне вучняў. Настаўніца пахваліла Даніка за яго ўчынак і павяла ўсіх дзяцей да помніка.)*

***Слова настаўніка.*** У межах рэалізацыі школьнага праекта "Жыву. Люблю. Ганаруся" мы таксама актыўна ўдзельнічаем у мерапрыемствах, накіраваных на ўшанаванне памятных месцаў воінам-землякам мікрараёна нашай школы. Давайце разам нагадаем, якую работу мы праводзім. *(Вучні узгадаюць: даглядаем памятныя месцы, праводзім урачыстыя лінейкі, ускладаем кветкі, правялі экспедыцыю "Дарогі Памяці").*

**Сярэдні ўзровень (2 вучні):** урывак з даследчай работы праекта "Жыву. Люблю. Ганаруся" — "Мой край, апалены вайной".

Вайна разбурыла ўсе мірныя планы, злавесным ценем навісла над кожнай хатай маіх землякоў. Колькі нявіннай крыві жанчын, дзяцей, старых праліта ворагам на нашай Шумілінскай зямлі. Званы Хатыні знак трагедыі беларускага народа. Такі ж лёс напаткаў і жыхароў вёскі Вялікія Ляжні. Вёска была спалена разам з людзьмі 27 кастрычніка 1942 года. Зараз на месцы спаленага хлява стаіць помнік у выглядзе валуна. Шэры валун напамінак аб неабходнасці берагчы памяць аб усіх, хто абараніў мір і жыццё.

***Слова настаўніка.*** Гераічна змагаліся нашы воіны. А гераізм — вяршыня патрыятызму, вернага служэння Бацькаўшчыне.

На дошцы запісаны верш:

*Мір, Радзіма, мама — усяму аснова.*
*Мір, Радзіма, мама — нам святыя словы*
*Замяніць і страціць нельга, немагчыма*
*Першыя паняцці: мама, мір, Радзіма (В. Жуковіч).*

Працягніце ланцужок слоў, якія вы лічыце галоўнымі ў сваім жыцці: мір, Радзіма, мама, сям'я, дом, бацькі, родны куток, наша школа, сябры…

Падвядзенне вынікаў работы з тэкстам.

Фізкультмінутка:

*Устаньце разам, усміхніцеся,*
*Зямлі нашай пакланіцеся*
*За шчаслівы дзень учарашні.*
*Усе да сонца пацягніцеся,*
*Улева, управа нахіліцеся,*
*Раз прысядзьце, два прысядзьце*
*І за парты ціха сядзьце.*

Трэнажор для вачэй.

Гульня "Чацвёрты лішні" *(умова гульні: на кожнай парце – карткі са сказамі. Тры сказы звязаны агульнай тэмай урока, чацвёрты – лішні. У сказах трэба паставіць знакі прыпынку і вызначыць ішні сказ. Падчас гульні вучні абмяркоўваюць варыянты):*

1. Радзіма маці, чужына мачыха.
2. На родным полі расце лепшая доля.
3,. Свой край гэта рай.
4. Свая зямля аснова жыцця.

***Слова настаўніка.*** Якая асноўная тэма аб'яднала гэтыя прыказкі?

Сапраўды, прыказкі — чароўны і мудры скарб, які вучыць нас дабрыні, працавітасці, самаадданай любові да роднай краіны, роднага краю.

**VI. Кантрольна-карэкцыйны этап.**

Праца з падручнікам. Пераклад тэксту з рускай мовы на беларускую *(практыкаванне 152).*

1. Узорнае чытанне тэксту настаўнікам.
2. Вызначце тэмы, асноўныя думкі.
3. Зварот да перакладнога слоўніка.
4. Пісьмовы пераклад.
5. Падкрэсліць граматычную аснову, дзе выказнік выражаны назоўнікам.

***Слова настаўніка.*** Родныя вобразы, хлеб і вада, сонца — тое, без чаго чалавек не можа існаваць, менавіта ўсё гэта выключная каштоўнасць для чалавека. Любоў да ўсяго роднага можна перадаць па-рознаму: словам, фарбамі. Зараз мы паспрабуем разам з вамі выказаць свае пачуцці сродкамі жывапісу.

Звярніце ўвагу на пейзажны малюнак. *(На дошцы пейзаж зімы, вясны, восені, лета.)* Падрыхтуйце вуснае выказванне "Мая вёска самая прыгожая, калі наступае… *(вучні апавядаюць аб прыгажосці свайго кутка ў розныя поры года).*

**VII. Замацаванне.**

Франтальнае апытанне. Метад "Кубік Блума".

Вучань падкідвае кубік, на гранях якога напісаны словы "Даведаўся", "Навучыўся", "Паўтарыў", "Замацаваў", "Буду выкарыстоўваць", "Спатрэбіцца".

**VIII. Падвядзенне вынікаў.**

**Слова настаўніка.** Задачы ўрока мы выканалі. У кожнага кветачка вельмі значна падрасла, а гэта значыць і вашы веды дасягнулі адпаведных вышынь. А цяпер зрабіце вывад: Што вы засвоілі на ўроку?

**IX. Каменціраванне і выстаўленне адзнак.**

**X. Дамашняе заданне.**

Агучваннне таго задання, да якога мы звярталіся ў пачатку ўрока (1–2 узровень).

3 узровень — практыкаванне 151, § 20.

4 узровень — практыкаванне 151, лінгвістычнае паведамленне па тэме "Сказ. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам".

**XI. Рэфлексія.**

***Слова настаўніка.*** Наш урок хачу закончыць радкамі з верша Рыгора Барадуліна:

*У акіяне слоў — ані мяжы, ні донца.*
*Ёсць там адна аснова:*
*Праца і праца бясконца!*

Няхай гэтыя словы стануць дэвізам у вашай вучобе.

Якім быў настрой на сённяшнім уроку?

Дзякуй за працу.

*Дата поступления в редакцию: 29.06.2023*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ ПАЗНАВАЛЬНАГА ЗАНЯТКА "У КОЖНАЙ ПЕЧЫ СВОЙ КУЛІЧ"

*Шкурко Раіса Міхайлаўна*

**Мэта:** абуджэнне цікавасці у дзяцей да праваслаўных хрысціянскіх традыцый святкавання Светлага Вялікадня і далучэнне да традыцый свайго народа.

**Задачы:**

пазнаёміць дзяцей з праваслаўным святам Вялікдзень, з народнымі традыцыямі і звычаямі праваслаўнай культуры;

стварыць уласныя мастацкія працы;

развіццё духоўна-маральнага патэнцыялу навучэнцаў, творчых здольнасцей, мастацкага густу;

фарміраванне камунікатыўных кампетэнцый;

выхаванне павагі да народнай культуры свайго народа, праваслаўнай гісторыі;

стварэнне спрыяльнай эмацыйнай атмасферы на занятку; даставіць дзецям радасць, задавальненне.

**Матэрыялы і абсталяванне:** ручнікі, абрус, кошык з чырвонымі яйкамі, галінкі вярбы, наўтбук, ілюстрацыі кулічоў; шаблоны для творчай працы навучэнцаў; каляровыя самаклейная папера і кардон, клей-аловак, нажніцы, просты аловак.

**Ход занятка**

*Група ўпрыгожана ручнікамі, выявамі кулічоў, велікодных яек, стол засланы абрусам.*

*Гучыць музыка. Уваходзіць у групу педагог у ролі бабулі, апрануты ў народны касцюм, у руках кошык, у якім чырвоныя яйкі, галінкі вярбы.*

**І. Арганізацыйны момант.**

Добры дзень, мае даражэнькія, і дарослыя, і маленькія! Я так спяшалася да вас, бо ў мяне да вас вельмі цікавая размова. Вы гатовы мяне слухаць і мне дапамагаць? Тады ўсміхніцеся хутчэй і ўсім нам будзе весялей.

**ІІ. Вызначэнне тэмы занятка.**

Сёння я хачу з вамі пагаварыць пра традыцыі і звычаі нашых продкаў, як яны адпачывалі, як святы святкавалі.

А якія святы вы ведаеце? *(Адказы дзяцей).*

Паглядзіце ў мой кошык. *(Дзеці заглядваюць у кошык).* Можа, па прадметах, якія ў ім знаходзяцца вы даведаецеся, пра якое свята мы будзем гаварыць? *(Адказы дзяцей).*

Сапраўды, сёння мы пагаворым пра свята свят – Вялікдзень. Як і ўсе праваслаўныя святы, Вялікдзень багаты на абрады і традыцыі. Сёння мы даведаемся, як да яго рыхтаваліся даўней, як праводзілі, як гулялі, як гасцей частавалі.

**ІІІ. Знаёмства з гісторыяй паходжання свята.**

Можа хто з вас што ведае пра гэта свята? (*Адказы дзяцей).*

Вялікдзень — самае галоўнае хрысціянскае свята. У гэты дзень увесь праваслаўны свет адзначае Уваскрэсенне Ісуса Хрыста з мёртвых. У Ерусаліме Ісус быў укрыжаваны на крыжы, але на трэці дзень пасля смерці Ён уваскрэс. З таго часу ў гэты дзень усе праваслаўныя людзі святкуюць вялікае свята – Светлае Хрыстова Уваскрэсенне. Храмы ў гэты дзень упрыгожваюцца, святары апранаюць самыя прыгожыя ўборы, а вернікі стаяць з запаленымі свечкамі і чакаюць першых велікодных спеваў. Гэты Вялікі Дзень прыходзіць да нас яркім сонейкам, чыстым дажджом, светлай радасцю, надзеяй і верай у сілу дабра і кахання.

**IV. Знаёмства з традыцыямі і звычаямі святкавання Вялікадня.**

Існавала многа традыцый і звычаяў святкавання Вялікадня. Многія з іх захаваліся і да гэтага часу.

Да гэтага свята рыхтуюцца доўга: імкнуцца больш маліцца, не грубіяніць, быць паслухмянымі і адказнымі. Вялікі пост — час глыбокага смутку.

Вербная нядзеля — апошняя нядзеля перад Вялікаднем. У наш час амаль у кожнай сям'і да Вербнай нядзелі стаяць у хаце асвечаныя ў царкве галінкі вярбы. Са старажытных часоў існавала павер'е, што квітнеючае дрэва можа даць здароўе, сілу, прыгажосць усім, хто закране яго. У беларусаў гаючым, надзеле-